МІЖНАРОДНЫ КАНГРЭС
ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСІ

Працоўныя Матэрыялы
ІІ-га Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі
Том 2, 2013

# Правілы прадстаўлення тэкстаў

**Тэрмін прадстаўлення матэрыялаў:** 1 студзеня 2013 года.

1. Памер: **5-8 тысяч** друкаваных знакаў.
2. Мова: беларуская, ангельская, польская, літоўская, руская.
3. Перад тэзісамі трэба дадаць анатацыю (**на мове арыгіналу** і **па-ангельску**, не больш за 500 знакаў кожная) і ключавыя словы (каля 5 ключавых словаў на мове арыгіналу і па-ангельску).
4. Напрыканцы тэксту неабходна пазначыць (на мове арыгіналу і па-ангельску): **a) імя, b) навуковую ступень, c) інстытуцыю.**
5. Файлавы фармат: .doc, .rtf (просьба без значнай неабходнасці файлы не архіваваць).

Калі тэзісы, якія вы падавалі перад Кангрэсам, не патрабуюць дапрацоўкі, усё адно маем просьбу прагледзець іх уважліва, дадаць неабходную інфармацыю і ў абноўленым выглядзе падаць для выдання зборніка.

Інфармацыю пра правілы афармлення тэкста і спіса літаратуры гл. ніжэй.

Усе дадатковыя пытанні, а таксама самі матэрыялы дасылайце, калі ласка, на адрас: icbs@palityka.org

ПАЛІТЫЧНАЯ СФЕРА

Часопіс палітычных даследаванняў
**Journal of Political Studies**
www.palityka.org

## Правілы прадстаўлення матэрыялаў для публікацыі

Часопіс палітычных даследаванняў “*Палітычная сфера*” прапануе поўную электронную працэдуру падачы і рэцэнзавання артыкулаў. Прадастаўленне матэрыялаў ажыццяўляецца праз e-mail: info@palityka.org.

Тэматыка матэрыялаў можа не супадаць з асноўнай тэмаю нумару.

Тэксты не могуць утрымліваць **плагіят**. Рэдакцыя захоўвае за сабой права публічнага аб’яўлення пра знаходжанне плагіяту ў дасланых тэкстах.

У рэдакцыю прадастаўляецца арыгінальны тэкст, які да гэтага не друкаваўся ні ў выглядзе асобнага артыкула, ні як частка манаграфіі (у тым ліку і ў электронных выданнях).

Артыкулы, дасланыя ў рэдакцыю праходзяць абавязковае ананімнае **навуковае рэцэнзаванне.**

Асноўны тэкст не павінен утрымліваць прозвішча аўтара і іншых падобных спасылак па тэксту.

Далейшае перавыданне тэксту павінна ўтрымліваць спасылкі на выданне ў часопісе “*Палітычная сфера*”. Гэта таксама тычыцца выкарыстання артыкулаў пры напісанні манаграфій, публікацыі ў Інтэрнэце і г.д.

Пра перавыданні тэксту і выкарыстанні яго для іншых публікацый неабходна паведаміць у рэдакцыю часопіса “*Палітычная сфера*”.

**Асноўныя патрабаванні:**

1. Мінімальны памер артыкула складае 35 тысяч друкаваных знакаў, максімальны – 55 тысяч (уключая спасылкі і спіс літаратуры).
2. Акрамя тэкста неабходна прадставіць: a) інфармацыю пра сябе, b) анатацыю тэкста, c) ключавыя словы.
3. *Інфармацыя пра сябе*. Інфармацыя пра сябе павінна ўтрымліваць пазначэнне дысцыпліны, краіны, акадэмічнага і адміністратыўнага статуса і іншую важную інфармацыю. Памер 2–3 сказы.
4. *Анатацыя.* Анатацыя павінна адлюстроўваць асноўныя ідэі тэксту. Памер: не больш за 120 слоў (аптымальны памер 70–80 слоў). Анатацыя прадстаўляецца на мове артыкула і па-англійску.
5. *Спіс ключавых словаў*: 4-5 ключавых словаў.

Анатацыя тэкста, спіс ключавых словаў і біяграфічныя дадзеныя падаюцца у **асобным файле.**

Патрабаванні да **афармлення тэксту** (гл. ніжэй).

# Правілы афармлення публікацый

**Пунктуацыя:**
Выкарыстоўвайце ў тэксце круглыя дужкі ().

**Цытаванні:**
Фразы, якія цытуюцца павінны быць вылучаны курсівам і ўзяты ў двухкоссі.
*«Палітыка гэтай краіны дэманструе…»*

Пры цытаванні трэба захоўваць аўтарскую пунктуацыю і арфаграфію. Калі ў фрагменце прысутнічаюць відавочныя памылкі дазваляецца ўстаўкі “(так і тэксце)” ці “(sic)”.

**Імёны і прозвішчы:**
Пры згадцы асобы ў першы раз падаецца яе поўнае імя. Надалей дазваляецца ўжываць замест імёнаў ініцыялы ці проста прозвішча *Напрыклад:* Макс Вэбер, а не М. Вэбер.

Імёны асобаў, якія не з’яўляюцца агульнавядомымі, падаюцца ў дужках на мове арыгіналу.
*Напрыклад:* “Том Браўн (Tom Brown) кіраваў рэгі□нам…”

**Абрэвіятуры:**
Назвы арганізацый і г. д., якія не з’яўляюцца агульнавядомымі, падаюцца ў поўнай версіі (таксама на мове арыгіналу). Затым у дужках падаецца абрэвіятура, якая можа выкарыстоўвацца далей па тэксту.

**Даты:**
Даты падаюцца такім чынам: 5 ліпеня 2008 года.

Для напісання стагоддзя выкарыстоўвайце рымскія літары.
*Прыклад*: XX стагоддзе (ст.), VII стагоддзе (ст.)

**Лічбы:**
У тэксце адсоткі варта падаваць сімвалам %.
*Прыклад:* 6%, 52–58% і г.д.

Лічбы ў некалькі тысяч падаюцца без пунктуацыі, дзесяткі, сотні тысяч і г. д. вылучаюцца кропкамі.
*Прыклад:* 8356, 4380, 14.576.

У пазначэнні старонак ці перыяду падаюцца поўныя лічбы.
*Прыклад:* 44–48, 1956–1962, 1980-я (а не 80-я).

**Спасылкі і каментары:**
Спасылкі і невялікія каментары афармляюцца ў нізе старонкі (footnote). Спасылкі пазначаюцца арабскімі лічбамі, якія ставяцца пасля пунктуацыі.

Спасылкі да табліцы робяцца ўнізе табліцы. Унізе табліцы пазначаецца крыніца табліцы. Слова Крыніцы падаецца курсівам, пасля чаго ставіцца двухкроп’е *Прыклад: “Крыніцы:* Міністэрства статыстыкі…”

**Спасылкі на тэксты і аўтараў:**

Спасылкі на аўтараў у тэксце суправаджацца пазначэннем аўтара, года публікацыі і старонкі (калі ёсць).

Не выкарыстоўвайце ibid., op. cit., infra і г.д.

Калі імя аўтара падаецца ў тэксце, то ў дужках ставіцца год.
*Прыклад*: Іваноў (1996) у свой час напісаў…

Калі праца аўтара напісана не на мове артыкула, то ў дужках пазначаецца арыгінальнае імя аўтара.
*Прыклад*: Іваноў (Ivanou, 1996) у свой час напісаў...

Калі імя аўтара не згадваецца ў тэксце, спасылка афармляецца наступным чынам:
*Прыклад*: Некаторыя працы (Котаў, 2004) не падзяляюць такую пазіцыю…

Калі неабходна, за датай публікацыі ставіцца старонка (праз двухроп'е).
*Прыклад*: Як было адзначана раней (Green, 1855: 836) …

Калі тэкст мае двух аўтараў, неабходна даць ім□ны абодвух праз "і" (and). Калі аўтараў больш – дадаецца "і інш." (et al.).
*Прыклад*: Было заўважана (Янаў і Мальцаў, 2002; Nort and Feer, 2010), што…
*Прыклад*: Але многія аўтары з гэтым не пагаджаюцца (Кабякоў і інш., 1995; James et al., 1998)...

Калі аўтар мае больш за адну публікацыю на працягу года, неабходна ўставіць a, b, і г.д (а, б, в і г. д. калі крыніцы на кірыліцы).
*Прыклад*: Абмеркаванне такіх вынікаў можа бачыць тут (Hill, 2002a: 33–36)

Розныя крыніцы і тэксты падзяляюцца кропкай з коскай.
*Прыклад*: Розныя аўтары ў гэтым пагаджаюцца (Волкаў, 1994: 22; Шамякін, 1997; Снопков, 1992: 84)...

Калі даецца спасылка на больш чым адну працы аднаго аўтара, яго імя варта ўзгадаць адзін раз, раздзяляючы даты публікацый коскамі.
*Прыклад*: Такія пазіцыя ў прынцыпе характэрныя для Адамса (Adams, 1976: 4, 1985: 8, 2002: 274)...

Уключайце ў дужкі ўсе кароткія каментары да спасылка "гл.", "асабліва".
*Прыклад*: Большасць даследчыкаў згодны (гл. Якабсон, 1990: 204–249)

Калі аўтарам □сць не асоба, а інстытуцыя, падавайце кароткі пачатак назвы.
*Прыклад*: Апошняе заява гэта толькі пацвярджае (Цэнтральная камісія, 2006)...

Для артыкулаў без аўтараў выкарыстоўваецца назва часопіса, газеты ці арганізацыі , але не назва артыкула.
*Прыклад*: Маем і іншыя меркаванні (*Чырвоная зорка*, 1994)...

Спасылкі на асабістыя размовы (інтэрв'ю) не ўключаюцца ў спіс літаратуры.
*Прыклад*: (Мяснікові́ч, 14 траўня 1992, асабістая размова).

Праверце, каб па тэксту было дакладна зразумела на каго ідзе спасылка і іншае цытаванне.

**Афармленне бібліяграфіі:**

Усе публікацыі, якія згадваюцца ў тэксце ці спасылках павінны быць поўнасць прыведзены ў бібліяграфіі. Бібліяграфія павінна быць аформлена ў такім выглядзе:

**Часопісныя артыкулы:**

Іваноў, Самуіл (1999). “Беларуская палітычная сістэма ў 1996 годзе: падзеі і наступствы”, *Палітычная прастора*, №17(2): 281–346.

Judd, Todd (1994). “Political System of Senegal and Niger: 1960–1975”, *Journal of Politics and History,* 6(3): 319–342.

*Заўвага*: найперш падаецца том часопіса па агульнай нумарацыі, у дужках пасля падаецца нумар часопіса за канкрэтны год. Калі ў нумарацыі часопіса адсутнічаюць тамы, то падаецца толькі агульны нумар.

**Кнігі:**

Мядзведзеў, Сяргей (1996). *Культура адукацыі: стратэгіі і праекты.* Мінск: Беларуская навука.

Kennedy, Martine, ed. (2004). *Culture and War.* London: Whitehouse.

**Главы ў кнігах:**

Кузняцоў, Ігар (1995). “Сацыяльна-эканамічная эвалюцыя Заходняй Беларусі ў 1921–1931 гадах,” у Сяргей Савельеў (рэд.), *Перспектывы даследавання беларускай гісторыі*. Менск: Новая гісторыя.

Kerner, Otto (1998). “The Places of Memory,” in Richard Mormino and Peter Limeberry (eds), *Memory Studies.* New York: Chapters.

**Старонкі ў Інтэрнэце**

Ягораў, Сяргей і Траскавіцкі, Андрэй (1992). “Даследуючы сацыяльную дынаміку”, *Грамадства і палітыка,* №2(1), URL (доступ 3.05.1999): http://fdsmv.gftre.as.de/tecf3

Logan, David and Cohn, Ulrich (2004). “Social and Political Resistance”, *Journal of Post-war Studies,* 3(2), URL (consulted 02.04.2006): http://herft.as.be/vol2

**Публікацыі афіцыйных арганізацый**

World Bank (1998). *World Development Indicators, 1997*. Washington DC.

**Артыкулы ў газетах**

*Савецкае Палессе* (1956). “Нашы поспехі.” 9.12.1956.

*The Economist* (1998). “Food Riots.” 2.03.1998.

**Артыкулы ў газетах (аўтарскія)**

Дземянцей, Віктар (2004). “Адзін год у іншай краіне”. *Зара над Нёманам,*04.08.2004.

Mixter, David (1994). “The Enemy of the State.” *The Economist*, 04.04.1994.

**Архіўныя крыніцы**

Ластоўскі, Вацлаў (1925). *Ліст да Антона Луцкевіча*, 18.05.1925. НАРБ, Ф. 42, воп. 1, спр. 5, арк. 6.

Green, David (1833). *Diary*, 05.04.1833. British Library, MS Cotton Caligula D III, fol. 15.

**Іншыя заўвагі да бібліяграфіі**

Спіс павінен быць у алфавітным парадку (да *Mc* трэба ставіцца як да *Mac*)

Прозвішчы, якія ўтрымліваюць de, van, von, De, Van, Von, de la павінна размяшчацца пад D, V, адпаведна (De Roux, Van Dijk), тое самае пры цытаванні ў тэксце

Ім□ны якія маюць Jr (малодшы) ці II (другі) трэба цытаваць такім чынам: Raiser, Todd, Jr (1996), Smith, D.D., II (1995)

Публікацыі, у якіх першы аўтар той самы, павінны размяшчацца ў такім парадку:

- Адзін аўтар – храналагічны парадку выхаду кніг (артыкулаў)
- Калі прысутнічае некалькі публікацый з аднаго году, то пасля даты дадаецца паслядоўна лацінскія літары a, b, c, d и г.д.

- Публікацыі, якія маюць двух аўтараў размяшчаюцца ў алфавітным парадку ў адпаведнасці з прозвішчам другога аўтара
- Калі публікацыя мае тры аўтары, яна змяшчаецца пасля пазіцый з двума аўтарамі ў алфавітным парадку, па другому, трэцяму і г.д. аўтару.

**Прыклад А.**

Вярцінскі, Сяргей (1974) …
Вярцінскі, Сяргей і Янаў, Пётр (1972) …
Вярцінскі, Якаў (1980) …
Вярцінскі, Якаў (1982a) …
Вярцінскі, Якаў (1982b) …
Вярцінскі, Якаў і Карнееў, Віктар(1988) …
Вярцінскі, Якаў і Малакан, Уладзімір (1986) …
Вярцінскі, Якаў, Сідорскі Андрэй і Пяткевіч, Лявон (2002)...
Вярцінскі, Якаў, Таргавіцкі, Аляксей і Андрэеў, Віктар (1998)...

**Прыклад В.**

Black, Anthony (2008)...
Black, Richard R. and Yates, Peter(2006)...
Black, Thomas (2002)...
Black, Thomas (2006a)...
Black, Thomas (2006b)...
Black, Thomas and Smith, Martin (2008)...
Black, Thomas and White Peter (2008)...
Black, Thomas, Hughes, James and Kent, Thomas (2002)...
Black, Thomas, Luis, Mihael and White, Stephen (2004)...

Праверце, ці ўсе перыядычныя выданні маюць: том, нумар, старонкі, а кнігі: выдавецтва, месца публікацыі